Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 26 (717) ● Пятніца, 4 кастрычніка 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

## ВЕРАСЕНЬ—ПРАЦЫ, КАСТРЫЧНІК—ВУЧОБЕ

Верасень большасць студэнтаў правяла на калгасных палях, і тут, як нельга лепш, праявіліся іх працавітасць і добрасумленнасць, таварысцкая ўзаемадапамога, высокае ўсведамленне доўгу.

У агульнай працы ўзмацнела дружба, лепш высветліліся рысы характару аднакурснікаў, з якімі побач крочыш па універсітэцкіх ступеньках.

Карысным быў гэты месяц і для першакурснікаў. Ён паклаў першыя цаглінкі ў фундамент новых калектываў.

Як правіла, студэнты нашага універсітэта, дзе б ім ні прышлося працаваць, усюды стараліся, выступалі з канцэртамі і лекцыямі і заваявалі павагу сельскіх працаўнікоў. Паспяхова завяршылі працоўны семестр студэнты фізічнага факультэта. Многа падзяк прывезлі географы, А вось з філалагічнага і факультэта журналістыкі паступаюць непрыемныя весткі. Тут многія студэнты ўхіліліся ад працы, адсядзеліся ў цёплым мясцечку, схаваўшыся за спіны таварышаў. Знайшліся і сапраўдныя гультаі. Яны хоць і паехалі разам з усімі на ўборачныя работы, але на палях бывалі рэдка. Спадзяемся, першыя ж камсамольскія сходы на факультэтах дадуць адпаведную ацэнку паводзінам гэтых студэнтаў.

Кастрычнік ва універсітэце залівістым званком апавясціў аб пачатку заняткаў. Зноў запоўнены аўдыторыі і лабараторыі, шумна і весела ў калідорах у час перапынкаў. Здаецца, энергія маладосці выліваецца праз край. І важна захаваць яе запас на ўвесь напружаны навучальны год. Часу для раскачкі не застаецца. Каб выдатнымі поспехамі ў вучобе сустрэць 50-годдзе Ленінскага камсамола і знамянальны юбілей рэспублікі і яе Камуністычнай партыі, трэба з першых жа дзён устанавіць для сябе цвёрды рэжым дня. У мінулым навучальным годзе ў артыкуле «Выхаванне самастойнасці» (№ 10, 15 сакавіка 1968 г.) сакратар партбюро фізічнага факультэта П. Л. Салаў прывёў як узор распарадак дня, якім карыстаюцца некаторыя студэнты-выдатнікі фізічнага факультэта. Гэты артыкул зацікавіў многіх нашых чытачоў. Знайшліся паслядоўнікі фізікаў, якія здолелі ўдасканаліць нават гэты шчыльны рэжым і дасягнулі высокіх вынікаў.

Дарагія сябры! Новы навучальны год уступіў у свае правы. Вас чакаюць чытальныя залы і вучэбныя кабінеты, лабараторыі і навуковыя гурткі, скарбніцы ведаў, якімі трэба авалодаць. Не трацьце часу. З першых дзён — за вучобу, каб юбілейны год рэспублікі і Ленінскага камсамола адзначыць самымі лепшымі падарункамі — выдатнымі ведамі.

### Імі ганарыцца універсітэт

## ДАРОГА ДАЎЖЫНЁЙ У ЖЫЦЦЁ

Кожную раніцу вось ужо многа год у будынак, дзе размешчаны філалагічны факультэт, энергічна ўваходзіць невысокая, на дзіва жывая, прывабная жанчына з крыху стомленымі вачыма. Яна падымаецца на кафедру. Па-маладому, звонка гучыць хвалюючы голас:

— Савецкая літаратура—самая перадавая, самая ідэйная...

Сотні дапытлівых вачэй, насцярожаная ўвага аўдыторыі... Ідзе лекцыя доктара філалагічных навук, прафесара рускай савецкай літаратуры Любові Іванаўны Фіглоўскай.



Калі слухаеш лекцыі Любові Іванаўны, заўважаеш, з якой сардэчнай папераджальнасцю і дабразычлівасцю яна гутарыць са студэнтамі, з якім юнацкім натхненнем гаворыць пра сённяшні дзень нашай літаратуры і наколькі шырокія і шматгранныя яе інтарэсы, дык цяжка паверыць, што за плячыма у гэтай жанчыны 60 доўгіх год.

Жыццё Любові Іванаўны здзіўляюча ёмістае, таму што ў ім у нейкай ступені адбіліся рысы нашага цудоўнага часу. Возьмем з біяграфіі некалькі старонак, паміж якімі аднак пралягло не адно дзесяцігоддзе...

Басаногае нядоўгае дзяцінства прайшло ў смаленскай вёсачцы, сярод хвойнага раздолля, сагрэтага прыгажосцю вясенніх зорак і ціхім еумам асенняга лістападу. Голадна было ў беднай сялянскай хаце, а вясковая дзяўчынка марыла аб ведах. Цяжка сказаць, якой была б яе жыццёвая дарога, калі б не Кастрычніцкая рэвалюцыя. Унучка і дачка беднага селяніна атрымала права на веды, стала настаўніцай. Яна актыўна ўдзельнічае ў будаўніцтве маладой Савецкай краіны, становіцца камсамолкай. Выпускніца Мсціслаўскага педагагічнага вучылішча ў няпоўных 16 год па мандату доўга, па жаданню камсамольскага сумлення едзе ў глыб Палесся. Тут, у глухой вёсцы, што згубілася сярод топкіх балот і сініх бароў, пачынаецца працоўны шлях будучага прафесара. Цікава, што недалёка ад гэтых месц настаўнічаў у страшны царскі час класік беларускай літаратуры Якуб Колас, вывучэнне творчасці якога стане многа год пазней навуковым захапленнем Фіглоўскай. Калі Любоў Іванаўна даследавала творчую гісторыю трылогіі «На ростанях», ёй былі асабліва зразумелымі і блізкімі беды і радасці коласаўскага героя — палескага настаўніка.

Адгучалі на Палессі баі з польскай белагвардзейшчынай. Было трывожна ў гэтым глухім «забытым богам і людзьмі» краі. Юнай настаўніцы даводзілася не толькі весці заняткі ва ўсіх чатырох класах Капліцкай школы, размешчанай у старэнькай хацінцы, але і змагацца з забабонамі ў вёсцы, арганізоўваць драмгуртон, расказваць пра новае жыццё, а вечарамі пры святле лучыны вучыць пісьменнасці бацькоў сваіх вучняў. Работы было хоць адбаўляй. Марудна, але ўпэўнена мянялася аблічча стаўшых дарагімі вёсак Песні і Капліцы. І тым неадступней станавілася жаданне вучыцца далей.

У 1927 годзе Любоў Іванаўна паступае ў Беларускі універсітэт. Праўда, была мара паступіць на фізіка-матэматычны факультэт. Аднак актыўную дзяўчыну, за плячыма ў якой, нягледзячы на маладосць, ужо быў багаты працоўны вопыт, камсамольцы БДУ пасылаюць для ўмацавання філфака. Так, у філалогію Любоў Іванаўну прывяло на першых парах падпарадкаванне камсамольскай дысцыпліне. Але ўжо вельмі скора студэнтка Фіглоўская з радасцю пераканалася, што навука аб літаратуры—яе сапраўднае прызванне, якое стала пасля любімай справай усяго жыцця. Вучылася ахвотна, натхнёна, выяўляючы нахіл да навуковай працы.

Пасля універсітэта—праца ў Акадэміі навук БССР. У перадваенныя гады паспяхова абаронена кандыдацкая дысертацыя. У 1956 годзе Любоў Іванаўна становіцца доктарам філалагічных навук, прафесарам. Такія вехі жыццёвага шляху...

Даследчая зацікаўленасць Л. І. Фіглоўскай вельмі шырокая: яна вывучае творчасць Кандрата Крапівы, Змітрака Бядулі, Лідзіі Сейфулінай, Марыэты Шагінян. Аб творчасці Якуба Коласа напісана ёмістая, глыбокая манаграфія, высока ацэненая навуковай грамадскасцю.

Прафесар Фіглоўская — сааўтар многіх падручнікаў па беларускай літаратуры для сярэдняй школы. Пад яе кіраўніцтвам на кафедры савецкай літаратуры вядуцца цікавыя актуальныя даследаванні, чытаюцца спецыяльныя курсы па вострых, надзённых праблемах савецкай літаратуры.

Любоў Іванаўна Фіглоўская паспяхова спалучае ў сабе здольнасці нястомнага вучонага і тэмперамент лектара. Яе лекцыі вылучаюцца тэарэтычнай глыбінёй, абгрунтаванасцю, эмацыянальнай усхвалёванасцю, у аснове якіх шчырая, сур'ёзная ўлюбёнасць у роднае слова.

Паглыбленая ў неспакойную працу загадчыка кафедры, Любоў Іванаўна вядзе вялікую грамадскую работу. Яе пастаянна выбіраюць членам партбюро факультэта, многія гады актыўна працуе ў праўленні таварыства «Веды», з гонарам выконвала дэпутацкія абавязкі. Плённая навуковая, педагагічная дзейнасць, актыўная грамадская работа прафесара Фіглоўскай неаднаразова адзначана граматамі, а грудзі яе ўпрыгожваюць ордэны «Знак Пашаны», Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Імкненне быць карысвай людзям, шчырая любоў да іх—гэта галоўныя рысы характару Любові Іванаўны. яе жыццёвае крэда. Яна блізка, як асабістую боль, перажывае лёс аслепшага студэнта і клапоціцца аб яго працоўным уладкаванні, дапамагае сваім вучням наладзіць маладую сям'ю, дапазна заседжваецца на кансультацыі. Каля яе заўсёды людзі, да яе цягнуцца, таму, што ў ей бясконцы запас энергіі, любві, асаблівага густу да жыцця і такой каштоўнай чалавечай якасці, як дабрата.

Любові Іванаўне Фіглоўскай 60 год. Калегі, віншуючы яе з юбілейнай датай, выказваюць упэўненасць, што яшчэ многія гады Любові Іванаўны будуць палымнець тым жа высакародным гарэннем. Яна па-ранейшаму будзе шчодра аддаваць людзям розум, цяпло, дабрату сваёй вялікай душы!

І. ЛУШЧЫЦКАЯ,
ст. выкладчык кафедры рускай савецкай літаратуры.



## НА МЕРЫДЫЯНАХ ДРУЖБЫ

Нядаўна камітэт камсамола нашага універсітэта запрасіў да сябе на святкаванне 50-годдзя Ленінскага камсамола групу нямецкіх сяброў з Іенскага універсітэта (ГДР). Разам са студэнтамі запрошаны і сакратар акружкома Герхардт Шрэтар і сакратар камітэта Саюза свабоднай нямецкай моладзі Іенскага універсітэта Вальфганг Гёвінг.

● ● ●

Амаль увесь верасень 30 студэнтаў-філолагаў з Вышэйшай педагагічнай школы горада Кракава і дзесяць беларусаведаў з Варшаўскага універсітэта знаходзіліся ў нашым універсітэце на азнаямленча-вытворчай практыцы, рыхтавалі матэрыялы для сваіх дыпломных работ.

За гэты час польскія студэнты праслухалі цыклы лекцый. Перад імі выступілі прафесар А. Е. Супрун, дацэнты П. П. Шуба, Н. Н. Рамашка і А. А. Лойка. Польскія сябры прысутнічалі на ўроках нашых студэнтаў-філолагаў, якія праходзілі практыку ў школах Мінска.

У вольны час польскія студэнты знаёміліся з горадам, наведвалі музеі, тэатры, славутыя мясціны сталіцы Беларусі, выязджалі на экскурсію ў Маскву і Ленінград.

Развітваючыся, польскія студэнты шчыра дзякавалі за сардэчны прыём, абмяняліся з новымі сябрамі сувенірамі і выказалі пажаданне ў будучым годзе сустрэцца зноў.

● ● ●

Дзесяць студэнтаў-хімікаў нашага універсітэта нядаўна вярнуліся з Балгарыі, дзе праходзілі азнаямленча-вытворчую практыку пры Сафійскім універсітэце.

З такой жа мэтай хутка на хімфак прыедуць студэнты Сафійскага універсітэта. Зараз хімікі рыхтуюцца да сустрэчы са сваімі сябрамі на гасціннай беларускай зямлі.

# КРЫНІЦА НЕВЫЧЭРПНЫХ ВЕДАЎ

Закончылася нядоўгае летняе зацішша, і зноў запоўнены універсітэцкія чытальныя залы. Сёння мы наведаем адзін з іх — зал для навуковых супрацоўнікаў. Адкрыты ён быў яшчэ ў 1962 годзе, і з той пары ў яго сценах напісаны не адзін дзесятак дысертацый, сотні старонак новых падручнікаў і навуковых прац, каштоўныя артыкулы па фізіцы, хіміі, матэматыцы, біялогіі і іншых галінах навук.

Тут усё спрыяе плённай рабоце — і свабодны доступ да літаратуры, вялікі выбар айчынных і зарубежных перыядычных выданняў, і сама абстаноўка — ідэальны парадак, чысціня, утульнасць і, вядома, чуллівыя клопаты яго гаспадароў, старшых бібліятэкараў А. А. Эвенчык і Р. І. Ляховіч.

Не адно пакаленне студэнтаў вырасла на вачах старэйшага работніка універсітэцкай бібліятэкі Анны Аронаўны Эвенчык. Да яе некалі бегалі па самую-самую неабходную кніжку першакурснікі, і яна ўстанаўлівала чарговасць і старалася надзяліць кожнага. Дазваляла іншы раз вынесці падручнік на ноч у інтэрнат, але з той умовай, каб раніцай кніга была на месцы. І рэдка хто адважваўся парушаць гэтую ўмову. Усе даражылі давер'ем старэйшага таварыша. Ёй давяраліся мары і самыя запаветныя жаданні, з ёй дзяліліся поспехамі і шукалі яе спачування ў хвіліну непрыемнасці. Такой жа клапатлівай, бязмежна ўважлівай Анна Аронаўна застаецца і цяпер.

Нямала добрых слоў удзячнасці чула за сваю дваццацігадовую бібліятэчную работу і Раіса Іосіфаўна Ляховіч.

Сёння кола чытачоў шырокае і разнастайнае: аспіранты, асістэнты, выкладчыкі шматлікіх універсітэцкіх кафедр. Узрост тых, хто карыстаецца паслугамі чытальнага залу,— ад 20 да 60 год. Тут мы сустракаем і вядомага прафесара, і зусім юнага члена студэнцкага навуковага таварыства.

Шукальнікі гэтай скарбніцы ведаў — выкладчыкі хімічнага факультэта дацэнты А. А. Вечар, В. В. Свірыдаў, В. Ф. Бяляеў, Г. І. Васільева. Пастаянна працавалі тут над дысертацыямі Т. П. Каратаева, Н. І. Кунцэвіч. З 1963 года моцна звязана з чытальным залам Любоў Іванаўна Продан. Сёння побач з ёй займаюцца і яе вучні.

З дня ў дзень працуе ў бібліятэцы Л. В. Патаніна. Часта можна бачыць тут і матэматыкаў І. І. Камяка, М. А. Ізобава, прафесара В. П. Платонава, асістэнтку А. Э. Жыгота, фізікаў Г. А. Шагісултанаву, І. К. Сінішчука, а таксама юрыстаў, географаў, біёлагаў.

Штодзённыя наведвальнікі чытальнага залу — многія выкладчыкі кафедр грамадскіх дысцыплін, такія, як Н. І. Хрыпко, Г. Г. Герасіменка. Толькі для прафесара Г. М. Ліўшыца супрацоўнікі чытальнага залу выпісалі па МБА з буйнейшых бібліятэк Масквы і Ленінграда каля ста кніг. А вынікам працы гэтага актыўнейшага чытача з'явілася некалькі яго кніг па гісторыі.

Часта працуюць у гэтым зале госці універсітэта — слухачы курсаў удасканалення выкладчыкаў, замежныя студэнты і аспіранты. У верасні нямала гадзін правяла ў чытальным зале група студэнтаў-фізікаў з ГДР, яны знаёміліся з нашай айчыннай спецыяльнай літаратурай.

— У нас захоўваюцца часопісы на рускай і замежных мовах за двухгадовы перыяд і ўсе рэфератыўныя часопісы, што маюцца ў бібліятэцы,— расказвае Раіса Іосіфаўна.— Адзін раз у дзесяць дзён поўнасцю мяняецца выстаўка новых часопісаў па тэмах: фізіка, хімія, матэматыка, біялогія. Па суботах знаёмім наведвальнікаў з рэфератамі, атрыманымі за тыдзень з усіх куткоў Саюза. Аддзел камплектавання арганізуе ў нас выстаўку тэматычных планаў выдавецтваў з тым, каб атрымаць кваліфікаваныя рэкамендацыі аб набыцці патрэбнай літаратуры. Часта карыстаюцца чытачы і нашай інфармацыйнай картатэкай замежных часопісных артыкулаў па фізіцы, якую пастаянна папаўняюць бібліографы.

Рэгулярна да юбілейных дат мы рыхтуем выстаўкі работ нашых вучоных.

Ёсць у нас і невялікі фонд — каля 300 мікрафільмаў, якія выкарыстоўваецца і выкладчыкамі, і аспірантамі.

Анна Аронаўна вядзе спецыяльную падшыўку тэматычных выразак з газет, у якой сабраны цікавыя артыкулы, што асвятляюць жыццё нашага універсітэта і іншых навучальных устаноў, матэрыялы аб завочным навучанні.

Вялікае запатрабаванне, вядома, і на літаратурна-мастацкія, навукова-папулярныя часопісы, ілюстраваныя выданні краін народнай дэмакратыі. Прыгожыя стэнды так і запрашаюць пазнаёміцца з жыццём Балгарыі, даведацца аб венгерскіх навінах, зрабіць падарожжа ў Германскую Дэмакратычную Рэспубліку.

У гэтым годзе, рыхтуючыся да напружанай працы, супрацоўнікі чытальнага залу зрабілі парадак ва ўсім фондзе літаратуры, для больш зручнага карыстання расставілі палічныя раздзяліцелі. Улічваючы вялікае запатрабаванне на ленінскія творы, адвялі асобныя паліцы для чацвёртага і пятага выданняў сачыненняў Уладзіміра Ільіча і тэматычных зборнікаў яго прац. Да юбілею рэспублікі і стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна рыхтуецца цэлы шэраг кніжных выставак.

Н. АЛІНА.





# МАЦНЕЕ ДРУЖБА

Дружба паміж студэнтамі з В'етнама і камвольшчыкамі завязалася з 1966 года. В'етнамскія студэнты БДУ імя Леніна — частыя і жаданыя госці на Мінскім камвольным камбінаце. Для студэнтаў падрыхтоўчага і асноўных факультэтаў праводзяцца экскурсіі на камбінат. Моладзь геранчнай краіны атрымлівае шырокую магчымасць пазнаёміцца з прадпрыемствам, з тэхналогіяй вытворчасці, з асартыментам прадукцыі.

Прадстаўнікі рабочай моладзі камбіната ў час студэнцкіх канікул адпачывалі ў гэтым годзе разам з в'етнамскімі студэнтамі ў спартыўна-аздараўленчым лагеры «Зялёнае».

Сувязь і дружба, якая існуе паміж камвольшчыкамі і в'етнамскімі студэнтамі будзе расці і мацнець.

Д. МАЁРАВА, сакратар камітэта камсамола прадзільнай вытворчасці Мінскага камвольнага камбіната.

# СТУДЭНТЫ ГЕРАІЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ

У 1961 годзе ў нашым універсітэце быў адкрыты падрыхтоўчы факультэт для замежных навучэнцаў, якія не валодаюць рускай мовай. Тут студэнты на працягу аднаго навучальнага года вывучаюць не толькі рускую мову, але і праходзяць курс падрыхтоўкі па фізіцы, матэматыцы, хіміі, чарчэнню, эканамічнай геаграфіі, біялогіі і іншых дысцыплінах, якія неабходны для іх будучай спецыялізацыі.

Адначасова ўсе студэнты падрыхтоўчага факультэта вывучаюць курс «Савецкі Саюз», шырока знаёмяцца з нашай савецкай рэчаіснасцю. З гэтай мэтай для іх арганізуюцца экскурсіі па гораду, у музеі, на прамысловыя прадпрыемствы, у дзіцячыя ўстановы; сустрэчы са старэйшымі камуністамі, з Героямі Савецкага Саюза і Героямі Сацыялістычнай працы, з рабочай моладдзю, студэнтамі і школьнікамі, дэманструюцца фільмы аб нашай Радзіме, аб яе мінулым і цяперашнім, аб новабудоўлях, праводзяцца гутаркі, чытаюцца лекцыі па самых розных пытаннях сучаснасці.

Тут створаны і ўжо на працягу некалькіх год працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці: харавы, танцавальны, мастацкага чытання, сольны. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці неаднаразова выступалі з канцэртамі ва універсітэце і іншых навучальных установах, на МТЗ, Мінскім камвольным камбінаце, у Палацы культуры прафсаюзаў, у школах беларускай сталіцы і іншых гарадоў рэспублікі.

Жыццё і вучоба нашых замежных сяброў рэгулярна асвятляецца ў факультэцкай насценнай газеце «Дружба, якую выпускаюць самі студэнты з дапамогай выкладчыкаў рускай мовы.

Да паслуг студэнтаў — бібліятэка, фанетычны кабінет, кінаўстаноўка, лабараторыі з неабходным абсталяваннем.

На факультэце працуюць вопытныя, добра падрыхтаваныя выкладчыкі: А. А. Рудэнка, Т. І. Анісімава, О. П. Вадэйка, А. В. Саннікава, Т. І. Ліпніцкая, А. В. Самаль, Э. М. Мазуркевіч, В. А. Мельнікаў, А. П. Сманцэр, Н. Г. Чумакова і многія іншыя.

За сем год падрыхтоўчы факультэт закончыла 700 юнакоў і дзяўчат з Кубы, МНР, ДРВ, краін Афрыкі. Яны працягваюць вучобу на асноўных факультэтах нашага універсітэта і іншых навуковых устаноў краіны. Многія студэнты першых выпускаў падрыхтоўчага факультэта ўжо закончылі вучобу па выбранай спецыяльнасці. Адны з іх паехалі на радзіму, дзе працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі, будуюць новае жыццё, другія — вучацца ў аспірантуры савецкіх вну.

Апошнія тры гады на падрыхтоўчым факультэце вучацца толькі в'етнамскія студэнты. У верасні прыступілі да заняткаў 133 студэнты. Яны размеркаваны ў вучэбныя групы па сем чалавек, створаны секцыі на кафедры рускай мовы і патокі на кафедры прыродазнаўчых дысцыплін.

Работа двух кафедр падрыхтоўчага факультэта, яго грамадскіх арганізацый, усіх выкладчыкаў і супрацоўнікаў наладжана ў адпаведнасці з планам падрыхтоўкі да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. На факультэце па-ранейшаму вялікая ўвага ўдзяляецца не толькі навучанню студэнтаў рускай мове і спецыяльным дысцыплінам, але і азнаямленню іх з савецкім жыццём. У гэты юбілейны год у жыцці беларускага народа, у жыцці Ленінскага камсамола мы шырока знаёмім в'етнамскую моладзь з дасягненнямі нашай рэспублікі ў галіне эканомікі, навукі і культуры за 50 прайшоўшых год, са слаўнымі старонкамі пяцідзесяцігадовай гісторыі ВЛКСМ. Ужо прачытан шэраг лекцый, праведзены гутаркі на гэту тэму. В'етнамскія юнакі і дзяўчаты зрабілі экскурсіі па гораду і ў Дом-музей І з'езда РСДРП, на выстаўку дасягненняў Брэсцкай вобласці ў беларускай сталіцы, прагледзелі многа лепшых савецкіх беларускіх фільмаў аб камсамоле, аб нашай рэспубліцы, нашым народзе.

Можна не сумнявацца, што, сустракаючы пяцідзесяцігадовы юбілей БССР і Кампартыі Беларусі, калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў падрыхтоўчага факультэта зробіць усё для таго, каб добра падрыхтаваць усіх студэнтаў да прадаўжэння вучобы па выбранай спецыяльнасці, выхаваць іх адданымі справе інтэрнацыяналізма, дружбы з савецкім народам.

**М. ГАРБАЧОЎ,**
**дэкан падрыхтоўчага факультэта, кандыдат эканамічных навук.**

**НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) першая экскурсія; цікавыя сустрэчы.**

Фота М. Нічыпарэнкі.



# РЭХА ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА



Сёлетні навучальны год для студэнтаў першага курса пачаўся з працоўнага семестра. Мы, вядома, хваляваліся: ці справяцца яны так паспяхова з работай, як яны справіліся з уступнымі экзаменамі? На першым жа курсе радыёфізікі — 60 медалістаў з 80 чалавек, фізікі — 143 медалісты з 250. Які ён, першакурснік, на паверку?

У саўгасе «Натальеўскі» працавала 132 чалавекі. Мы на полі. Групай кіруе асістэнт В. А. Пер'яновіч. Звяртаемся да брыгадзіра брыгады «Замятоўка» С. І. Грынкевіча.

— Група працуе добра. Норма ўборкі бульбы штодзённа выконваецца. Выдатна працуюць студэнты Пеця Жых, Галя Заранчук, Станіслаў Шостак і іншыя.

— Выдатна працуюць і ўсе дзяўчаты, — дабавіў В. А. Пер'яновіч.

## ТАК ТРЫМАЦЬ, ПЕРШАКУРСНІКІ!

Прыязджаем на поле, дзе працуюць 10-я і 14-я групы першага курса. Яны збіраюць агуркі. Пытаемся ў брыгадзіра І. А. Пяхоты, як ідуць справы.

— Працуюць цудоўна, рабяты сур'ёзныя. Прыкладам у выкананні норм з'яўляюцца Віктар Наумчык, Мікалай Баркоўскі, Аляксандр Баброў і іншыя.

Выключныя водгукі аб рабоце дзяўчат.

Наступны на нашым шляху саўгас «Новыя Зэлянкі». Шостая і восьмая групы прыступілі да працы пасля абеду. Брыгадзір В. А. Касцюк расказвае:

— У нас яшчэ не сабрана 25 гектараў бульбы і 47 гектараў карняплодаў. Рабяты прыехалі добрыя. Яны нам вельмі дапамогуць.

Дружна сустракаюць нас студэнты 5, 7, 9 груп першага курса, дзе старшымі з'яўляюцца С. А. Кіслякоў і В. І. Анішчык. І тут работа кіпіць. У выхадны дзень і пасля працы студэнты праводзяць спартыўныя спаборніцтвы з моладдзю саўгаса.

Прыкладнымі працаўнікамі паказалі сябе Оля Бутрыновіч, Павел Рэзнікаў, Люда Пятручык, Наташа Ільюшэнка, Валерый Маладых і іншыя.

Добра арганізавалі працу і радыёфізікі першага курса ў саўгасе «Светач». Хоць збіраліся неўраджайныя сарты бульбы, рабяты былі поўныя рашучасці выконваць норму і прад'явілі свае патрабаванні кіраўніцтву саўгаса, заявіўшы, у прыватнасці, што вазы пад бульбу ім патрэбны на полі да 8—9 гадзін раніцы, а не пазней. Групай тут кіраваў Н. Е. Велікевіч.

Добра папрацавалі групы, дзе кіраўніком быў В. С. Гракаў. З вялікай цеплынёй рабяты гаварылі аб сваіх паварах Жане Кірылавай, Мішы Коціку, Толі Курыловічу. І толькі аднаму студэнту, Фурфуру, не па смаку было вясковае харчаванне і ён дрэнна працаваў. Праўда, «дапамагаў» яму яшчэ Лукашэвіч.

Прыемна было слухаць добрыя водгукі аб працы першакурснікаў удзельнікам паездкі па саўгасах — загадчыку кафедры электрафізікі У. Г. Вафіядзі, намесніку дэкана факультэта М. С. Гарашчуку і Жэні Цікову.

**П. САЛАЎ,**
**сакратар партбюро фізфака.**



Багаты ўраджай бульбы вырасцілі ў юбілейным годзе калгасы і саўгасы Мінскага раёна. Значную дапамогу на ўборцы аказалі сельскім працаўнікам студэнты нашага універсітэта.

**НА ЗДЫМКАХ:** Група 3-га курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры ў час работы. Прыклад у працы заўсёды паказвала Валя Давыдовіч.

Фота С. Сцяпанава.

# МНЕ ПРЫСНІЛАСЯ КАРТОШКА...

Мне прыснілася картошка, картошка, раскіданая па баразне, жоўтай гарой насыпаная на машыне, печаная картошка, растаючая ў роце.

І гэта было амаль як наяву, амаль як у калгасе імя Свярдлова, у вёсцы Дые Чэрвеньскага раёна, куды паслалі нас, 50 чалавек першакурснікаў геафака.

Першы курс... Калі 4 верасня мы прыйшлі да універсітэта, дзе панавала ажыўленне і мітусня, між волі адчулі сябе крыху падаўленымі. Пачыналася новае жыццё. Якое ж яно будзе? Вось гэтыя яшчэ незнаёмыя твары вакол цябе — гэта твары тваіх будучых сяброў. Тады мы зусім не ведалі адзін другога. Але вось першае знаёмства, садзімся ў машыны, цесната, смех, і гэтыя думкі адступаюць, недзе знікаюць. Новае жыццё пачалося.

А пасля... Пасля першая баразна, першая нязграбна паднятая картошка, і першае, вельмі марудна насыпанае вядро. І ты з міжвольнай зайздрасцю назіраеш за Галяй Камінскай: здаецца і стараешся, і картошкі ў цябе столькі ж, а яна ўсё ж так далёка ўперадзе. І калі ў галаву прыходзіць думка, што баразна гэта, відаць, ніколі не скончыцца, і калі ты гатоў адчуць сябе самым няшчасным чалавекам на зямлі, побач з тваімі рукамі паяўляюцца яшчэ і яшчэ пары рук, і картошка, здаецца, сама пачынае весела скакаць у вядро. На дапамогу прыйшлі сябры. А сяброўская дапамога — вялікая рэч. Менавіта ў такія ж хвіліны нараджаецца і мацнее калектыў.

Мацнелі і мы. У працы выяўляліся вартасці і недахопы кожнага з нас. Як і ў кожным калектыве, добрага было значна больш. І сапраўды, ёсць за што паважаць маіх новых таварышаў: Т. Гвардзіну, Н. Кіслову, М. Валадзько, Г. Літвінюка, А. Абліцова і іншых. Мне з імі было добра працаваць, я рада, што буду з імі вучыцца.

Але вось мы ў горадзе, нам ужо вядомы вынікі нашай працы: намі сабрана 285 тон картошкі, пасеяна 130 га азімых і зроблена яшчэ многа рознай работы.

Мы прыйшлі ў аўдыторыі, якія па школьнаму звычаю называем класамі. Але нам яшчэ не раз прысніцца пачатак нашага студэнцкага жыцця — картошка, раскіданая па баразне, жоўтай гарой насыпаная на машыне, печаная картошка, растаючая ў роце.

**З. ВАСІЛЬЕВА,**
студэнтка 1-га курса геолага-геаграфічнага факультэта.

# ЛАЙДАКІ

**Ад аўтобуснага прыпынку да калгаснай сядзібы, дзе капалі мае студэнты бульбу, мне заставалася прайсці не так многа, можа, з кіламетр. Каб хутчэй дабрацца да вёскі, я шпарыў напрамкі, нешырокай лясной сцяжынкай. Шызы туман даўно ўжо падняўся над густым сасоннікам, пахла хваёвым настоем і асенняй сырасцю. І раптам тут, у гэтым сасонніку, запахла печанай бульбай. Блізка вёска, падумаў я і прыбавіў ходу. Але прайшоўшы некалькі крокаў, я вымушаны быў разачаравацца: лесу і канца не відаць.**

**Пацягнула дымком... Пастухі!.. — мільганула думка. Але і тут памыліўся. Касцёр гарэў у часціры. Каля агню было двое. Адзін з іх, выцягнуўшы ногі, соладка спаў. Другі — выгортваў з кастра абгарэлыя бульбіны — рыхтаваў паесці «стомленаму».**

**Не кожнаму шанцуе ў нашыя часы сустрэць у беларускіх лясах «палескіх рабінзонаў», а вось мне шчасце ўсміхнулася. Асобы ля кастра мяне зацікавілі. Я наблізіўся... Але што за праява!.. Гэта ж мае знаёмыя... Адкуль!**

**...На калгаснае поле мы вярталіся разам, мае палонныя беглі спераду і жалобна malілі:**

**— Не гаварыць дэкану...**

**— Мы больш не будзем...**

**— Мы выправімся.**

**— Нікому не расказвайце...**

**Вечарам таго ж дня камсамольскі сход студэнтаў першага курса факультэта журналістыкі разбіраў персанальную справу. На лаве падсудных сядзелі Лахманенка і Анохін. Настрой у іх быў не з лепшых — затуманеныя вочы, галовы — уніз.**

**Адзін за другім выступаюць прамоўцы...**

**— Трэба адправіць на факультэт, няхай там усё раскажуць аб сваіх паводзінах. Колькі можна цярпець. Гэта не першы раз...**

**— Строгую вымову!..**

**— Узяць на парукі... Можа выправяцца, усё ж камсамольцы.**

**— Мы паедзем дамоў, а іх пакінем на некалькі дзён, няхай папрацуюць...**

**На гэтым і вырашылі: Лахманенку і Анохіна пакінуць на два дні капаць бульбу пасля таго, як развітаемся з калгасам.**

**Дзень ад'езду. Я падыйшоў да брыгадзіра і прапанаваў, думаючы, што той узрадуецца.**

**— Дык вось, мы пакідаем вам падмогу, рабочую сілу. На два дні ў вас застануцца Лахманенка і Анохін. Выкарыстоўвайце, як пажадаеце.**

**— Хто-хто!.. — брыгадзір разгарнуў свой блакнот (два прозвішчы былі абведзены чорным алоўкам), — Лахманенка і Анохін! Дзякую. Што Вы! Я ж вымушан буду за імі ставіць яшчэ двух наглядчыкаў. Яны ж не будуць працаваць. Гэта ж — лайдакі. У выніку мы не выйграем, а прайграем, два сваіх працадні. Не-не. Дзякую. Толькі не пакідайце...**

**Мне нечага было сказаць. І я вымушан быў задаволіць яго просьбу.**

**Апошні раз я бачыў сваіх знаёмых «рабінзонаў», калі студэнты атрымлівалі грошы за сваю працу. Першымі ў чарзе стаялі Анохін і Лахманенка.**

**А. КАРПІЧ.**

# МАЛАЙЦЫ, РАБЯТЫ!

У калгас імя Дзімітрава, што на Чэрвеньшчыне, на сельскагаспадарчыя работы былі пасланы студэнты-геаграфы першай і другой груп трэцяга курса. З першага дня студэнты вырашылі працаваць так, каб аказаць значную дапамогу калгасу. А работа была не з лёгкіх — выбіраць бульбу за плугам або за бульбакапалкай. Нягледзячы на гэта, зменныя нормы штодзённа выконваліся на 100—110 працэнтаў. Асабліва вызначыліся сваёй працавітасцю студэнты першай групы. За час работы яны сабралі бульбу на 15 гектарах, амаль па гектару на чалавека! Пасля поўнага разліку кожны са студэнтаў групы атрымаў (за вылікам расходаў на харчаванне) па 45—47 рублёў. Нядрэнная падтрымка ў студэнцкім бюджэце!

Старшыня калгаса А. Н. Дзямідаў і брыгадзіры дзвюх брыгад, дзе працавалі студэнты, засталіся вельмі задаволенымі зладжанай работай нашай моладзі. Праўленне і партбюро калгаса ўзнагародзілі кожную групу граматай.

Трэба адзначыць асаблівую працавітасць «мужчынскай палавіны». Хлопцы з дзвюх груп працавалі з асаблівым стараннем і агеньчыкам, апяраджваючы часта ва ўборцы бульбы прадстаўнікоў больш «слабага» полу.

Жадаем жа нашым працаўнікам такіх жа добрых поспехаў і ў вучобе.

Н. ЖУРАЎСКАЯ,
ст. выкладчык кафедры эканамічнай геаграфіі СССР.

# ЖЫЦЦЁ, АДДАДЗЕНАЕ ЛЮДЗЯМ

Пасля цяжкай і працяглай хваробы на 65-м годзе жыцця памёр загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Мікалай Фёдаравіч Кунін.

У асобе прафесара М. Ф. Куніна савецкая навука страціла вялікага вучонага ў галіне фізікі цвёрдага цела.

Вялікі ўклад М. Ф. Кунін унёс у распрацоўку пытанняў знешняга трэння, ударнай дэфармацыі металаў, уплыву дэфармацыі металаў на іх фізічныя якасці, паглынанне энергіі пры дэфармацыі металаў і сплаваў.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны М. Ф. Кунін займаўся распрацоўкай пытанняў, якія мелі вялікае значэнне для абароны краіны. Ім апублікавана каля ста навуковых артыкулаў і манаграфій, тры кнігі з якіх і 25 артыкулаў — па спецыяльных пытаннях.

М. Ф. Кунін быў не толькі вялікім вучоным, але і таленавітым выхавацелем навуковых кадраў. Ім падрыхтавана больш 20 кандыдатаў і дактароў навук, у тым ліку на кафедры фізікі цвёрдага цела БДУ імя Леніна пад яго кіраўніцтвам абаранілі кандыдацкія дысертацыі С. А. Кісякоў, А. В. Шыбаева, В. І. Пракошын, К. К. Жылік, Ры-Хасен,

Увесь свой жыццёвы шлях ад настаўніка сярэдняй школы да шырока вядомага фізіка Мікалай Фёдаравіч прайшоў, аддаючы сябе поўнасцю беззапаветнаму служэнню нашай Радзіме, развіццю савецкай навукі і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў для народнай гаспадаркі.

Усіх, хто працаваў разам з Мікалаем Фёдаравічам, прыцягвала яго незвычайная дабрата, душэўная чуласць, гатоўнасць заўсёды прыйсці на дапамогу разумнай парадай ці справай. У той жа час М. Ф. Кунін быў непрымірымым да недахопаў у рабоце, вызначаўся высокай патрабавальнасцю да сябе і таварышаў.

За восем год работы ва універсітэце Мікалай Фёдаравіч зрабіў многа для паляпшэння вучэбнай і навукова-даследчай работы, ў справе падрыхтоўкі навуковых кадраў. Свой багаты жыццёвы вопыт, майстэрства таленавітага педагога і выхавацеля, свае багатыя веды і навуковыя ідэі, не лічачыся з часам, Мікалай Фёдаравіч стараўся перадаць нам.

Заўчасная смерць Мікалая Фёдаравіча глыбокім болем адклікнулася ў сэрцах усіх, хто ведаў яго, і асабліва супрацоўнікаў нашай кафедры. Вобраз Мікалая Фёдаравіча быў і застанецца для нас назаўсёды ідэалам, да якога мы будзем імкнуцца ва ўсім нашым жыцці.

Хоць сярод нас няма сёння нашага настаўніка і сябра, мы, супрацоўнікі яго кафедры, пастараемся працягваць і развіваць усё добрае, што даў ён нам як педагог і вучоны. У нашых сэрцах назаўсёды захаваецца светлая памяць аб цудоўным вучоным і чалавеку Мікалаю Фёдаравічу Куніне.

**СУПРАЦОЎНІКІ КАФЕДРЫ ФІЗІКІ ЦВЁРДАГА ЦЕЛА.**

# У ДРУЖБЕ З МАСТАЦТВАМ

У нашы дні, калі ідзе жорсткая барацьба ідэй, пры якой усякая прамежкавая пазіцыя недапушчальная, недастойная, ганебная, мы павінны зрабіць усё, каб кожны студэнт стаў упэўненым барацьбітом за камуністычнае мастацтва. Уся сістэма працы ва універсітэце накіравана на гэта. Курсы лекцый па эстэтыцы, літаратуры, тэарэтычныя канферэнцыі, сістэма партыйнай і камсамольскай асветы, шматлікія паходы і экскурсіі, выкладанне светапоглядных дысцыплін, сустрэчы з любімымі настаўнікамі... Усіх форм не пералічыш. Адной з іх стала студэнцкая мастацкая самадзейнасць.

Свае добрыя традыцыі маюць у нас такія калектывы, як народны аркестр народных інструментаў, народная харавая капэла, танцавальны калектыў, першыя ўпэўненыя крокі робіць драматычны тэатр і эстрадны ансамбль. Вопыт гэтых калектываў паказвае, што непасрэднае прылучэнне да творчасці даволі станоўча ўплывае на ідэйнае і маральнае аблічча маладога чалавека. Кожнаму будучаму спецыялісту неабходна палюбіць мастацтва, няважна, ці ты станеш фізікам, ці хімікам. Табе важна, закончыўшы універсітэт, вынесці з сабой у жыццё не толькі вытворчую спецыяльнасць, а і ненасытную смагу да прыгожага. І няхай гэта будзе вялікая любоў на ўсё жыццё. Калі нават ты не будзеш спяваць, іграць на сцэне, танцаваць, ты будзеш актыўным гледачом, слухачом, чытачом, здольным запаліцца ясным праменем натхнення.

Але вернемся да нашых творчых самадзейных калектываў. Яны былі паўпрэдамі Беларусі на міжрэспубліканскіх святах песні ў Рызе, Тарту, Вільнюсе, на універсіядах краіны — у Ленінградзе, выступалі ў Маскве, Кіеве, Адэсе, сустракаліся з рабочай аўдыторыяй, жыхарамі тых сёл, дзе пралягалі цяжкія салдацкія дарогі бацькоў сённяшніх студэнтаў.

Але заняткі мастацтвам патрабуюць часу, могуць нам запярэчыць. Гэта сапраўды так. Але можна гаварыць і аб іншым. Многія беды пачынаюцца іменна з-за недастатковай занятасці і загружанасці студэнтаў. Трэба дабіцца, каб у кожнага студэнта было асабістае кола духоўных запатрабаванняў і асабістае ўменне рацыянальна і цікава выкарыстоўваць вольную хвіліну. І перш за ўсё для заняткаў мастацтвам. Злучыць два ўсемагутныя рычагі выхавання — навучыць студэнтаў думаць памарксісцкі і ўбачыць прыгажосць, адрозніваць, сцвярджаць яе — у прыродзе, у грамадстве, у саміх сябе, — гэта значыць перайсці рубікон. На жаль, мы толькі на подступах да яго. Многае тут залежыць ад выкладчыкаў. Кожны з іх незалежна ад прамой спецыяльнасці павінен любіць мастацтва, сачыць за яго развіццём. На жаль, ёсць і такія выпадкі, калі аб вядомай прэм'еры, кнізе, кінакарціне выкладчык дазнаецца ад сваіх студэнтаў. Да гэтай пары бытуе погляд, што нельга патрабаваць ад выкладчыка спецыяльных дысцыплін ведання мастацтва. Яно, маўляў, павінна праходзіць па другому ведамству. Такі падыход да злабадзённай тэмы выключае духоўны кантакт паміж «вядомымі» і «вядучымі».

Знаёмячыся з самадзейнымі калектывамі універсітэтаў прыбалтыйскіх рэспублік, мы былі прыемна здзіўлены, убачыўшы ў іх складзе людзей, якія ўжо даўно закончылі універсітэт. А нашы аспіранты, выкладчыкі, работнікі адміністрацыйна - гаспадарчай часткі стаяць у баку ад вялікай культурна-масавай работы.

Вялікую дапамогу ў фарміраванні эстэтычных поглядаў студэнтаў аказваюць нам самі дзеячы мастацтва і літаратуры. Майстры сцэны і кіно часта бываюць ва універсітэце.

На самым першакласным мастацтве вялікіх думак і яркіх форм неабходна адточваць здольнасць студэнтаў саперажываць з мастаком. Розум павінен паспяваць на дапамогу пачуццю. І тады мы даб'емся галоўнага: упэўненасць юнага грамадзяніна будзе праяўляцца не толькі ў мінуты ўрачыстасці, але і ў суровыя будні, перад тварам цяжкіх выпрабаванняў.

**С. ЛЫСЕНКА,**
**дацэнт філалагічнага факультэта.**



# СЯБРЫ!

## ПРАЎЛЕННЕ СТУДЭНЦКАГА КЛУБА УНІВЕРСІТЭТА АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР У НАСТУПНЫЯ КАЛЕКТЫВЫ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ:

**НАРОДНУЮ ХАРАВУЮ КАПЭЛУ.** Кіраўнік — заслужаны артыст БССР Аляксандр Іванавіч Білібін, канцэртмайстар — Уладзімір Рыжы, хормайстар — Валянціна Іванова.

**НАРОДНЫ АРКЕСТР НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ.** Кіраўнік — Міхаіл Аркадзьевіч Лісіцын.

**ТАНЦАВАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ.** Кіраўнік — Міхаіл Вікенцьевіч Лапша.

**СТУДЭНЦКІ ТЭАТР.** Кіраўнік — заслужаны артыст ЛССР Аляксандр Міхайлавіч Озераў.

**ЭСТРАДНЫ АНСАМБЛЬ.** Кіраўнік — Авенір Давыдавіч Вайнштэйн.

**ДУХАВЫ АРКЕСТР.** Кіраўнік — Яфім Бараноўскі.

**ВАКАЛЬНУЮ ГРУПУ.** Кіраўнік — Анатоль Афанасьевіч Каленічэнка.

**ЦЫМБАЛЬНУЮ ГРУПУ.** Кіраўнік — заслужаны артыст БССР Ханун Іосіфавіч Шмелькін.

Першакурснікі! Перад вамі адкрыта шырокая дарога ў свет мастацтва.

Запісацца ў пералічаныя калектывы або атрымаць сяброўскую параду, дзе лепш выявіць і прымяніць свае здольнасці, вы можаце ў 205 пакоі галоўнага корпуса з 10 да 17 гадзін.

*Г. КАРЖАНЕЎСКАЯ,*
студэнтка І курса філфака

## ПРАМОВА ЛЕНІНА

**Сёння клопаты адменены,—**
**Музыкі рытм і пявучасць.**
**І раптам—**
**Прамова Леніна**
**З магнітафона ўключанага.**
**Голас гучаў натхнёна,**
**Мацнейшы за гоман веку.**
**І зала прыціхла, як некалі**
**Прыціх завод Міхельсона.**

## УЗДЫМ

**З сабою вазьму у шлях**
**Дзяцінства светлыя плёсы,**
**Дзе жытняга поля пах**
**З пахам чаромхі сплёўся,**
**Дзе лёгкі узлёт зары,**
**Случы заінелай льдзінкі...**
**Мне лёс навек падарыў**
**Усе дарогі радзімы.**
**І ён не шкадуе, не,**
**Ні роздуму, ні усмешак**
**І мроіцца нават мне:**
**То лёс**
**Ці натхнёны верш!**



*ЗБАЖЫНА.* *Фотаэцюд С. СУПРУНА.*

*С. ЗАКОННІКАЎ,*
студэнт V курса філфака

## СВІЦЯЗЬ

Дубы з вады выходзяць, нібы віцязі,
Русалчынай сукенкай — туманы.
Глядзіць у неба пільным вокам Свіцязь,
Дзе промні, як струмені страмніны.

## БУДЗЕМ ЗНАЁМЫ!

Вісяць дажджы зялёныя над кручай,
Маланкі рыб у чорных каранях.
Я ціха апускаю ў хвалі рукі,
І хвалі ўраз цымбаламі звіняць.
І раптам выплывае белы замак,
Як птушка, з анямелай глыбіні,
І з віламі сяляне пад вазамі,
Жывыя Каліноўскага агні.
О, Свіцязь! Люстра праўды і дзівосаў!
Ты, як світанне, у лясах сівых!
Яшчэ не раз прыду да гэтых плёсаў
Адчуць, што край мой вечны і жывы.
Яшчэ не раз твой вобраз з новай сілаї
Успыхне, нібы сонца, у душы...
Бунтуй жа, кроў, агнём любв ў жылах,
І сэрца век натхненнем калышы.
Не ламі дугой густыя бровы,
Не бяры на сэрца драбязы.
Што было, аб тым няма размовы,
Напамін не выкліча слязы.
Сум плыве, як музыка, працяжны.
Сэрца ахінаючы спярша,
Хоць мо гэта болей важна,
Чым ад шчасця светлая душа.
Можа сум, нібыта і ачышчэнне
Ад уяўнай фальшы пачуцця,
Можа, каб прыйсці да празарэння.
Мала нам і цэлага жыцця?
Не такая доўгая дарога
Да труны ад матчынай страхі
А жыццё з людзьмі пытае строга
За любоў, за славу, за грахі.
Плача і смяецца ўся планета.
Кожная пясчынка на віду.
Прыдзе час — нябачанай каметай
Ля крыніц сцюдзёных упаду.
Будуць жыта жаць на Белай Русі,
Загрукоча Нарачы прыбой.
Ветрам, снегам, сонцам паўтаруся —
Толькі вечна я, зямля, з табой.
Ну, а покуль халадзеюць росы,
Покуль мудрасць свой бярэ разбег,
Пасаджу маленькую бярозку,
Нібы свечку, людзям і сабе.

## НАРОДНЫЯ КАНТРАЛЁРЫ АБМЕРКАВАЛІ

Адбылося першае ў новым навучальным годзе пасяджэнне агульнауніверсітэцкай групы народнага кантролю. Разам з іншымі арганізацыйнымі пытаннямі заслухана паведамленне народных кантралёраў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі (дакладчык — т. Ляпёшкін) аб выніках праверкі аплаты рамонтных работ у галоўным корпусе. Пастанавілі вывучыць гэтае пытанне больш грунтоўна, для чаго вырашана стварыць кампетэнтную камісію, і вярнуцца да яго на наступным пасяджэнні.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

Са студзеня 1969 года пачне выходзіць часопіс «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна» па наступных серыях:

1. Матэматыка, механіка, фізіка (на рускай мове).

2. Біялогія, хімія, геалогія, геаграфія (на рускай мове).

3. Гісторыя, філасофія, эканоміка, права (на беларускай мове).

4. Філалогія, журналістыка (на беларускай мове).

Рэдакцыя просіць загадчыкаў кафедр правесці адпаведную работу па падрыхтоўцы артыкулаў для публікацыі іх у часопісе.

Аб'ём артыкула не павінен перавышаць 12 старонак машынапіснага тэксту.

Рэдактар А. НІКОЛЕНКА.

АТ 02410 Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон: Б-2-07-19. Зак. 1689.